**Тэма**: задачы на сустрэчны рух (знаходжанне адлегласці) (урок 1)

**Мэты:**

пазнаёміцца з рашэннем задач на сустрэчны рух на знаходжанне адлегласці;

навучыцца рашаць задачы на сустрэчны рух з выкарыстаннем чарцяжа.

1.Адзнач адзінкі вымярэння скорасці.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *км* | *км/г* | *м* | *м/мін* | *г* | *мін* | *м/мін* |

2.Як знайсці адлегласць? Адзнач правільны адказ.

- Трэба адлегласць падзяліць на скорасць руху.
- Трэба скорасць памножыць на час руху.
- Трэба скорасць падзяліць на час руху.

3.Падбяры схему да задачы.

Два аўтамабіля выехалі адначасова з двух гарадоў і сустрэліся праз 4 гадзіны. Першы аўтамабіль рухаўся са скорасцю 100 км/г, а другі – са скорасцю 70 км/г. На якой адлегласці адзін ад аднаго знаходзяцца гэтыя гарады?







LIVEWORKSHEETS

4.Выберы выраз, які з'яўляецца рашэннем задачы.

*Маша і Каця адначасова выйшлі з дому насустрач адна адной і сустрэліся праз 10 мін. Маша ішла са скорасцю 50 м/мін, а Каця – 55 м /мін. На якой адлегласці знаходзяцца дамы дзяўчынак?*

| | | |
|---|---|---|
| 50•10+55•10 | 50:10+55 | 55•10–50•10 |

5. Разгледзь схему. Што абазначае кожны выраз? Злучы лініяй.




| | |
|---|---|
| 50 · 4 | Адлегласць паміж прыстанямі |
| 30 · 4 | Праплыў да сустрэчы карабель |
| 50 · 4 + 30 · 4 | Праплыў да сустрэчы катэр |



LIVEWORKSHEETS